Прачытайце назву твора. Разгледзьце малюнак. Як вы думаеце, хто пасварыўся? Прачытайце апавяданне і адкажыце на пытанне аўтара.

## Сварба

Пасварыліся вясна з зімою, ну і давай адна адной на злосць рабіць.

— Я, — кажа вясна на зіму, — не буду з табой шмат гаварыць!

— Маўчы, маўчы, — бурчала белая зіма.

Ну і пачалі адна адной наперакор рабіць. Зіма паўзе з марозам — вясна лезе з адлігай, і зноў няма парадку.



Цярпелі людзі, цярпелі, а пасля давай сход рабіць, давай ра́дзіць, на чыёй тут старане ім стаць. Адны казалі:

— Мы яшчэ не вымалацілі збожжа, не навазілі дроў, не адпачылі пасля летняй працы, хай пабудзе зіма.



Другія зноў крычалі:

— Вон зіму! Яна нас памарозіць; мы і так лапці патапталі, кажухі абадралі. Досыць нам яе; хочам вясны.

І немаведама, як то яно прайшло б на тым сходзе, каб не ўвайшоў старэнькі жабрак і не пачаў жаліцца на зіму.

Праўда, вушы былі абмарожаны, рукі патрэсканы, світка рвана, сам ён дрыжаў ад холаду. Увесь сход закрычаў у адзін голас:

— Не хочам зімы! Хай вясна ідзе да нас!

Бедная зіма горка заплакала, слёзкі яе цяклі са стрэх, разліваліся па зямлі, збягалі ў лужы, з лужаў — у рэчкі, з рэчак — у моры, з мораў — у акіяны.

А вясна смяялася, строілася ў кветкі, скакала на палях, песцілася па садах, шча-

бята́ла з птушкамі, цалава́лася з дзеткамі, аж пакуль не пасварылася з летам.

Хто цяпер адолее, скажыце, дзеткі, самі?

*Паводле Цёткі.*

1. Як наступалі адна на адну зіма і вясна?
2. Што казалі людзі на сходзе? Хто дапамог вырашыць спрэчку? Як гэта адбылося?
3. Прачытайце, як паявла сябе зіма. Што зрабіла вясна ў адказ? Чаму?
4. Якія прыродныя з’явы падказалі аўтару змест твора?
5. Падзяліце твор на тры сэнсавыя часткі. Пра што гаворыцца ў кожнай частцы? Перакажыце твор.

Зрабіце інсцэніроўку твора.

Жэ́ўжык — свавольнік.
Го́дзе — хопіць, дастаткова.

Прачытайце і адгадайце загадку. о з а м р

○ Без рук, без ног, а малявац умее.

Паслухайце верш і скажыце, пра якія прыкметы вясны ў ім гаворыцца.

## Песня аб вясне

*Якуб Колас*



Уцякай, мароз-дзядуля!
Чуеш ты, стары, ці не?
На пагорках — бу́лі-гу́лі! —
Песні чу́юцца вясне.

Звоніць, скача, як дзіцятка,
Гэты жэўжык-ручаёк,
На яго, бы тая матка,
Сонца кі́дае свой зрок.





...А зіма аж пачарнела —
Годзе ёй тут кросны ткаць!..
Гэй, мале́нства, жы́ва, смела
Выйдзем ве́сну прывітаць!

1. З дапамогай якіх слоў Якуб Колас паказвае мароз як жывую істоту?
2. Як гучаць песні вясны? Хто іх спявае? Чаму аўтар называе ручаёк жэўжыкам? З кім яго параўноўвае? Чаму?

3. З кім аўтар параўноўвае сонца? Што агульнае паміж маці і сонцам?
4. Ад чаго пачарнела зіма? Што забараняе зіме аўтар? У якім значэнні ўжыты выраз *кросны ткаць*?
5. З якім заклікам звяртаецца аўтар да дзяцей? Як вы разумееце выраз *вясну прывітаць*?
6. Хто адлюстраваны на малюнках? Прачытайце адпаведныя радкі верша.
7. Вывучыце верш на памяць.

Прачытайце словы беларускай народнай веснавой песні. З якімі надзеямі чакалі людзі вясну?

## Веснавая песня

*З народнага*

Блаславі, Божа мілы, зіму замыкаці,
Зіму замыкаці, вясну аклікаці.
Зімою ў вазочку, вясною ў чаўночку,
У цёплым леце ў карэце.
Дай, Божа, на жытачка род,
На статачак плод,
Людзям на здароўе.